9 Лаврищев, А. А. Международные отношения после Второй мировой войны : в 3 т. / А. А. Лаврищев, Д. Г. Томашевский. – Москва : Издательство политической литературы, 1963. – Т. 2. – 747 с.

10 Бахов, А. С. Организация Варшавского договора (правовые аспекты) / А. С. Бахов. – Москва : Наука, 1971. – 152 с.

**УДК 94:323.28(470):323.31(476)«1831»**

***Н. Д. Паплёўка***

## ПАЛІТЫКА ЦАРСКАГА ЎРАДУ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ШЛЯХТЫ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЯ ПАСЛЯ ПАЎСТАННЯ 1830–1831 ГОДА

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя накірункі і мерапрыемствы палітыкі царскага ўрада ў адносінах да шляхты Паўночна-Заходняга края пасля паўстання 1830–1831 года. Найбольш значнымі праявамі гэтай палітыкі сталі “разбор” шляхты, яе высяленне ў іншыя мясцовыасці імперыі, абмежаванні яе саслоўных і маёмасных праў. Аўтар падыходзіць да высновы, што ў выніку такой палітыкі становішча шляхецкага саслоўя значна пагоршылася.*

Паўстанне 1830–1831 гг., у якім шляхта прыняла актыўны ўдзел, стала важным фактарам далейшай эвалюцыі ўрадавай палітыкі расійскай ўлады ў адносінах да шляхты. Падаўленне паўстання і ўмовы панавання рэакцыі далі ўладам магчымасць для кардынальных дзеянняў. Пачаткам новай палітыкі стаў указ Мікалая 1 от 22 сакавіка 1831 г., згодна з якім ўдзельнікаў паўстання – “усіх дваран або шляхту”, якія прынялі ўдзел ва ўзброеным выступленні супраць “законнай улады”, загадвалася судзіць ваенным судом, іх маёнткі браць у казну, а іх дзетак мужчынскага полу аддаваць у ваенныя кантаністы [1].

Значная колькасць шляхты, якая падтрымлівала паўстанне, была пазбаўлена сваіх зямельных уладанняў. Канфіскацыя маёмасці шляхты прывяла да таго, што многія зямельныя ўчасткі і іншыя каштоўнасці былі перададзеныя рускім землеўладальнікам і служачым Расійскай імперыі, што істотна змяніла сацыяльную структуру і эканоміку гэтага рэгіёна. Гэта таксама прывяло да памяншэння ўплыву шляхты ў грамадстве. Пацярпелі і буйныя землеўладальнікі з ліку мясцовых магнатаў. Пазбавіліся часткі сваіх маёнткаў Чартарыйскія, Агінскія, Плятары, Радзівілы, Сапегі. Царызм пачаў ужываць канфіскацыю як адну з мер пакарання не толькі за непасрэдны ўдзел у паўстанні, але і за ўдзел у падрыхтоўцы да яго. Шляхта, што прыняла ўдзел у паўстанні, страціла права займаць дзяржаўныя пасады і права выбару судзей у мясцовыя суды. Для астатняй шляхты, для таго каб прыняць удзел у выбарах, уводзіўся маёмасны цэнз. Права выбіраць маглі толькі тыя дваране, якія мелі не менш як 100 душ прыгонных сялян або 3 тысяч дзесяцін незаселенай зямлі [2, с. 121]. З 30-х гадоў XIX ст. роля дваранскіх сходаў змяншалася, пасады замяшчаліся ўрадавымі чыноўнікамі.

Працягам палітыкі расійскай ўлады было стварэнне Камітэта заходніх губерняў. У 1831–1833 гг. асноўныя намаганні Камітэта былі скіраваны на хутчэйшую выпрацоўку мерапрыемстваў, якія бы прывялі да палітычнага заспакойвання пасля паўстання і збліжэння заходніх губерняў імперыі з рускімі правінцыямі. Камітэт быў заняты распрацоўкай указаў, якія тычыліся ў асноўным увядзення расійскага заканадаўства на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны. Усе прапанаваныя на разгляд Камітэта праекты адносна шляхты былі накіраваныя на памяншэнне колькасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

немаёмаснай шляхты і абкладанне яе павіннасцямі [3, с. 117–118]. Адным з першых у працы Камітэта паўстала пытанне разбору шляхты ў заходніх губернях. Вынікам стала выданне ўказа ад 19 кастрычніка 1831 г. "Аб разборы шляхты ў заходніх губернях і аб уладкаванні людзей дадзенай катэгорыі". Па гэтым указе шляхта была падзелена на тры катэгорыі: а) дваран, якія валодалі населенымі дваранскімі маёнткамі і сялянамі без зямлі або прыгоннымі і дваровымі людзьмі; б) дваран, якія не валодалі населенымі маёнткамі; в) шляхціцаў, якія ніякай установай не былі зацверджаны ў дваранстве і не валодалі населенымі маёнткамі [4].

У дакладзе камітэта па справах Заходніх губерній ад 28 лістапада 1831 г. М. М. Мураўёў прапанаваў увесці рускую мову ў справаводстве, замясціць польскія назвы месцаў і службовых асоб рускімі найменнямі. Мураўёў прапаноўваў прымаць прадстаўнікоў збяднелай шляхты на ніжэйшыя пасады ў дзяржаўных установах з наступным абавязковым разглядам іх дакументаў на дваранскую годнасць [5, с. 102].

Найбольш жорстка царскі ўрад дзейнічаў у адносінах да дробнай шляхты. Дробная шляхта была вельмі шматлікая, складала значны працэнт насельніцтва на Паўночна-Заходняга края. Расійскі ўрад не жадаў пагадзіцца з тым, каб надаваць дваранскія прывілеі шматлікай дробнай шляхце "Заходніх" губерняў. Прыраўнанне сацыяльнага і прававога стану немаёмаснай дробнай шляхты з расійскім дваранствам, якое ў большасці сваёй было землеўладальніцкім, азначала, што прывілегіі гублялі ў іх вачах сваю вартасць. Дробная шляхта разглядалася як пагроза, таму што яна актыўна ўдзейнічала ў паўстанні 1830–1831. Мікалай I не хаваў свайго варожага стаўлення да дробнай шляхты, якое ён выказаў наступнымі словамі: "дваране ў заходніх губернях – гэта тыя, хто мае маёнткі або за службу атрымалі чыны, а шляхта – гэта зброд людзей, якія дабіваюцца дваранскага статусу, не маючы на гэта ні правоў, ні дакументаў, шлёндаюцца без занятку або знаходзяцца ва ўслужэнні і з'яўляюцца класам самым шкодным і разбэшчаным" [3, с. 141].

Царскі ўрад пераводзіў дробную шляхту, якая ўдзельнічала ў паўстанні 1830–1831 г. і не здолела даказаць сваё паходжанне, у катэгорыю аднадворцаў заходніх губерняў. Прававы статус аднадворцаў заходніх губерняў быў блізкі да сялянства і мяшчанства і адрозніваўся ў асноўным толькі падымнай формай сплочвання падаткаў і зменшанай да 15 гадоў рэкруцкай павіннасцю. Яшчэ адным накірункам палітыкі расійскіх ўлад было высяленне шляхты ў іншыя рэгіёны імперыі. У выніку гэтага мерапрыемства тысячы шляхціцаў былі вымушаныя пакінуць свае дамы і маёнткі і адправіцца на пасяленне ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі. Некаторыя з іх былі вымушаныя пераехаць у Сібір, Каўказ ці ў Крым. Палітыка высялення дробнай шляхты прывяла да значнага паслаблення яе ўплыву ў грамадстве і да памяншэння колькасці шляхты ў рэгіёне ў цэлым [3, с. 141–142, 150].

Такім чынам, палітыка царскага ўрада ў адносінах да шляхты Паўночна-Заходняга края пасля паўстання 1830–1831 гг., была накіравана на ўмацаванне адзінства дваранскага саслоўя, што патрабавала выключэння з яго шэрагаў дробнай збяднелай шляхты. Гэтай мэце павінны быў служыць "разбор шляхты", а таксама высяленні немаёмаснай шляхты ў іншыя мясцовасці імперыі за межы "Заходняга" края. Змяншэнне эканамічнага і сацыяльнага ўплыву шляхты дасягалася канфіскацыямі зямельнай уласнасці. Вынікам такой палітыкі было агульнае пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага становішча шляхты, асабліва яе збяднелай дробнай часткі.

**Літаратура**

1 Полное собрание законов Российской империи. Собрание Второе. – Санкт-Петербург : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е. И. В. канцелярии, 1832. – Т. 6. [Отделение 1] – № 4444 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://nlr.ru/e-res/law_r/show_page.php?page=252&root=2/6/1/. – Дата доступа: 18.04.2023.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2 Туміловіч, Г. М. Палітыка царызму ў адносінах да дробнай ншяхты Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / Г. М. Туміловіч // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. : зб. навук. прац / Бел. дзярж. педагаг. ун-т ; рэдкал.: А. М. Люты [і інш.]. – Мінск, 1995. – С. 114–128.

3 Макарэвіч, В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.) / В. С. Макарэвіч. – Мінск : БДУ, 2018. – 315 с.

4 Полное собрание законов Российской империи. Собрание 2-е. – Санкт-Петербург : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е. И. В. канцелярии, 1832. – Т. 6. [Отделение 2] – № 4869 [Электронный ресурс]. – Режим доступа https://nlr.ru/e-res/law_r/show_page.php?page=134&root=2/6/2/. – Дата доступа: 18.04.2023.

5 Доклад комитета по делам Западных губерний Николаю I, основанный на записке могилевского губернатора М. Н. Муравьева // Белоруссия в эпоху феодализма: сб. док.: в 3 т. – Т. 4. / сост.: В. В. Чепко, В. В. Шатилло ; ред. В. В. Чепко. Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1961. – С. 97–107.

**УДК 94:351/354(470)**

***Н. Н. Подольный***

## ГОДЫ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СЛУЖБЫ И. С. АКСАКОВА И ИХ ЗНАЧЕНИЕ

*Статья посвящена изучению деятельности И. С. Аксакова как одного из представителей славянофильства, который внёс огромный вклад в сохранение и развитие идей славянофильства. Рассмотрен период с 1842 г. по 1851 г. жизни И. С. Аксакова, когда тот находился на государственной службе, которая непосредственно повлияла на творческую и общественную деятельность и мировоззрение мыслителя в дальнейшем.*

Иван Сергеевич Аксаков – выдающийся русский писатель, публицист, правовед, историк и общественный деятель XIX века. Он был одним из наиболее ярких представителей славянофильства в России, движения, которое возникло в первой половине XIX века и выступало за сохранение и развитие русской культуры и национальной идентичности.

Аксаков родился в 1823 году в Уфе в семье знатного дворянина. Его отец, С. Т. Аксаков, был известным писателем и общественным деятелем, который сыграл важную роль в формировании мировоззрения своего сына. Иван Сергеевич изучал историю, философию, литературу, богословие и математику. Он был убеждённым славянофилом и выступал за сохранение русской культуры и традиций [1, с. 97].

Образование молодой славянофил смог получить в одном из самых престижных высших учебных заведений, а именно в Императорском училище правоведения в Санкт-Петербурге, где основательно подготовился к государственной службе.

4 июня 1842 г. Аксаков окончил Училище правоведения с присвоением чина 9-го класса [1, с. 98].

Важную роль в формировании мировоззрения И. С. Аксакова сыграла его работа на должности помощника секретаря во II отделении 6-го уголовного департамента Сената, где Иван Сергеевич столкнулся с жестокой реальностью государственной службы. С 1842 г., когда Аксаков поступит на государственную службу, начнётся один из важнейших периодов жизни, который окажет огромное влияние на мировоззрение мыслителя. Под воздействием эмоций и чувств И. С. Аксаков позже напишет произведение «Жизнь чиновника, мистерия в 3-х действиях».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ